# Абазначэнне мяккасці зычных гукаў на пісьме.

**Мяккасць зычных на пісьме абазначаецца двума спосабамі**:
1) з дапамогай літар *е, ё, ю, я, і;*
2) з дапамогай мяккага знака.

# Правапіс мяккага знака

**Змякчальны мяккі знак пішацца пасля *з, л, н, с, ц, дз:***
1. На канцы слоў: *гразь, столь, дзень, сумесь, радасць, моладзь.*
2. У сярэдзіне слоў пасля мяккага зычнага перад наступным цвёрдым:
*пісьмо,дзядзька, цьма, барацьба, вазьму, дзьму.*
Мяккі знак тут захоўваецца і ў тых выпадках, калі пры змене формы слова наступны цвёрды зычны чаргуецца з мяккім зычным:
*у пісьме, да дзядзькі, у цьме, аб барацьбе, возьмеш, дзьме.*
3. Пасля ***л*** перад наступным зычным:
*колькі, пальцы, лялька, бэлька, гульня,* **але** *галлё, ралля.*
4. У назоўніках:
а) перад канчаткам **–мі**: *грудзьмі, коньмі, слязьмі, людзьмі, дзецьмі;*
б) перад суфіксам **–чык,** калі зыходнае слова заканчваецца на **–нь**:
*камень – каменьчык, агонь – агеньчык.*
5. У прыметніках:
а) з суфіксам **–еньк-, -аньк-, эньк-**:
*мякенькі, прыгожанькі, даражэнькі;*
б) утвораных ад назваў месяцаў на **–нь**, ад слова **восень,** кітайскіх назваў:
*чэрвеньскі, студзеньскі, восеньскі, тайваньскі.*
6. У лічэбніках: *пяцьдзесят, шэсцьсот, дзевяцьсот.*
7. У дзеясловах:
а) перад канчаткам 1-й асобы множнага ліку **–ма**: *злазьма, будзьма, сядзьма;*
б) перад канчаткам 2-й асобы **–це** (загадны лад): *кіньце, сядзьце, злазьце.*
8. У постфіксах **–сьці, -сь:** *калісьці( калісь), кагосьці(кагось), штосьці (штось).*
9. У прыслоўі: *ледзьве.*

**Мяккі знак не пішацца:**
1. пры асіміляцыйнай мяккасці: *збіраць – збор, змяняць – змена.*
2. пры перадачы фанетычнага падаўжэння: *ззянне, калоссе, вецце.*
3. перад суфіксам *-**ск-*** у прыметніках, утвораных ад назоўнікаў на *-**нь***, калі гэта не назвы месяцаў: *конскі, смаргонскі, хатынскі,* **але** *восеньскі;*
4. пасля губных у канцы слова: *верф, голуб, стэп, насып, восем;*
5. у словах *кончык, вагончык, балончык, меншы,* **але** *большы.*

# Правапіс раздзяляльнага мяккага знака і апострафа

**Раздзяляльны мяккі знак** пішацца пасля літар ***з, с, дз, ц, л, н,*** перад галоснымі ***е, ё, ю, я, і,*** калі яны абазначаюць два гукі ***[йэ], [йо], [йу], [йа], [йі]****:*

- у словах іншамоўнага паходжання: *медальён, барэльеф, альянс, Льюіс;*
- ва ўласных назоўніках, утвораных ад імён на ***-ій*** перад суфіксам ***-еў-(-ев-):*** *Аркадзій – Аркадзьеў, Аркадзьевіч, Васілій – Васільеў, Васільевіч, Васільеўка,* **але** *Васіль – Васілевіч, Анатоль – Анатолевіч, Генадзь – Генадзевіч;*
- у словах ***Ілья, Ульяна, Касьян*** і вытворных ад іх;
- у формах дзеяслова ***ліць:*** *лью, льеш, выльецца.*

**Запомніце:** *дзяк, дыякан, булён.*

**Апостраф** пішацца перад ***е, ё, ю, я*** і націскным ***і***:

- пасля прыставак, якія заканчваюцца на зычны: *міжʼярусны, абʼінець, зʼява;*
- у складаных словах пасля частак ***двух-, трох-, чатырох-***: *двухʼярусны, трохʼякарны;*
- у сярэдзіне слоў пасля зычных, акрамя ***з, л, с, дз, ц*** і ***ў*:** *інтэрвʼю, Вʼетнам, Бушʼе, Лукʼянаў, інʼекцыя, канʼюнктура, купʼё, сямʼя,* **але** *шчаўе, здароўе, салаўіны, саўю, Іўе.*

1. Версал...скі, смаргон...скі, ліпен...скі, звер..., кон...чык, вандроў...е, міл...ён, мен...ш, перабол...шаць, цян...шан...скі, грэл...яж, вераб...іны, саў...ю, трох...ярусны, надвор...е, Заслаў...е, сузор...е.

2.Познан...скі, камен...чык, воз...мем, Савел...еў, хтос...ці, дз...веры, кон...скі, Чэрвен...скі, Хатын...скі, аб...інець, двух...ярусны, мядз...ведзь, кан...ён, куп...ё, снежан...скі, пяц...сот, ц...мяны, абедз...ве.

3.Агледз...ся, урал...скі, Об..., кобрын...скі, карэн...чыкі, воз...чык, жнівен...скі, цюмен...скі, тайван...скі, пензен...скі, капыл...скі, любан...скі, Нарач..., алтар..., ровен...скі, голуб..., верасен...скі, сем.., пяц...дзесят, вагон...чык.

4.Чапял...нік, эмул...сія, кар...ерыст, піс...маносец, рэдз...ка, камп...ютэр, фал...ш, снежан...скі, разан...скі, трох...ярусны, інтэрв...ю, кімс...ці, Яўген...евіч, дз...ме, дз...веры, парц...ера, аген...чык, кон...чык.

5.Кап...яносец, перабол..шванне, змен...шыць, якіс...ці, філ...трат, раз...юшаны, фел...етон, кур...ер, агледз...ся, без...языкі, восен...скі, любан...скі, лепел...скі, струмен...чык ,шэсц...сот, Кляз...ма, рал...ля, чэрвен...скі, саў...ю.

6.Вераб...іны, верф...ю, абал...ю, Ул...яна, мыш...у, пяс...няр, піс...мен...нік, ц...мяны, хрэс...біны, з...ядаць, дз...мухавец,хадз...ба, кап....ё, ліпен...скі, кон...скі, Чэрвен...скі, чамус...ці, соцен...ка, старэн...кі, камен...чык.

7.Фал..шстарт, трыл...ён, легкавер...е,фал...цэт, куп...ё, стэрыл...ны, танюсен...кі, дзес...ці, абедз...ве, сен...ярыта, зац...мен...не, увас...мярых, коп...епадобны, трэл...яж, намыл...ся, паб...ешся, трох...ярусны, нян...чыць.

8.Салаў...іны, л...дзіна, раз...бяр, сен...ярыта, кін...це, памян...шаць, збол...шага, з...імправізаваць, В...етнам, жнівен...скі, хатын...скі, вас...мюдзесяц...цю, кампан...ён, атэл...е, кагос...ці, кан...ён, Кас...ян, мядз...ведзь.

9.Ледз...ве, аб...ектыў, шчаў...е, л...дзінка, прал...ня, гал...лё, сядз...це, піс...меннны, прос...ба, аб..імшэць, надвор...е, Об...ю, Сібір...ю, задз...мухаць, пяц...дзесят, малац...ба, бяз...рыб...е, дэкал...тэ, Цян...шан...скі, Разан...скі.

10.Імпул...с, ваз...мі, ваз...ня, каліс...ці, дз...веры, мял...чэйшы, змен...шыць, мадз...яр, вар...яцтва, кал...ка, з...ява, літ...аб...яднан...не, кас...ба, л...готы, куп...істы, Мал...ер, с...нежан...скі, дз...ве, мадэл...ер, разан...скі, лас...ён.

11.Ад...юнкт, саў...е, двух...ярусны, італ...янец, кал...е, міл...ярд, Іл...я, кастан...еты, абедз...ве, дз...ме, кахан...не, аб...інець, аб...ява, мен...шан...кі, без...ядзерны, кудыс...ці, іс...ці, л...гота, кон...чык, струмен...чык, чэрвен...скі.

12.Між...ярусны, дал...набойны, вас...місоты, гіл...яціна, п...едэстал, раз...юшаны, абедз...ве, едз...це, ліпен...скі, Чэрвен...скі, узмор...е, гроз...ба, выпрамен...ван...не, барац...біт, мядз...ведзь, ал...пінізм, вараб...іны.

13.Фур...ерызм, барел...еф, пад...язны, фел...д...егер, вар...іраваць, аб...інец, вынян...чыць, кон...скі, восен...скі, прамен...чык, кон...чык, соцен...ка, раз...юшаны, з...вяр...ё, бел...етаж, вел...вет, вал...яжны, без...языкі, абаў...ю..

1.Версальскі, смаргонскі, ліпеньскі, звер, кончык, вандроўе, мільён, менш, перабольшаць, цяньшаньскі, грэльяж, вераб’іны, саўю, трох’ярусны, надвор’е, Заслаўе, сузор’е.

2.Познанскі, каменьчык, возьмем, Савельеў, хтосьці, дзверы, конскі, Чэрвеньскі, Хатынскі, аб’інець, двух’ярусны, мядзведзь, каньён, Куп’ё, снежаньскі, пяцьсот, цьмяны, абедзве.

3.Агледзься, уральскі, Об, кобрынскі, карэньчыкі, возчык, жнівеньскі, цюменскі, тайваньскі, пензенскі, капыльскі, любанскі, Нарач, алтар, ровенскі, голуб, верасеньскі, сем, пяцьдзесят, вагончык.

4.Чапяльнік, эмульсія, кар’ерыст, пісьманосец, рэдзька, камп’ютэр, фальш, снежанскі, разанскі, трох’ярусны, інтэрв’ю, кімсьці, Яўгеньевіч, дзьме, дзверы, парцьера, агеньчык, кончык.

5.Кап’яносец, перабольшванне, зменшыць, якісьці, фільтрат, раз’юшаны, фельетон, кур’ер, агледзься, без’языкі, восеньскі, любанскі, лепельскі, струменьчык ,шэсцьсот, Клязьма, ралля, чэрвеньскі, саўю.

6.Вераб’іны, верф’ю, абалью, Ульяна, мышшу, пясняр, пісьменнік, цьмяны, хрэсьбіны, з’ядаць, дзьмухавец, хадзьба, кап’ё, ліпеньскі, конскі, Чэрвеньскі, чамусьці, соценка, старэнькі, каменьчык.

7.Фальшстарт, трыльён, легкавер’е,фальцэт, куп’ё, стэрыльны, танюсенькі, дзесьці, абедзве, сеньярыта, зацьменне, увасьмярых, коп’епадобны, трэльяж, намылься, паб’ешся, трох’ярусны, няньчыць.

8.Салаўіны, льдзіна, разьбяр, сеньярыта, кіньце, памяншаць, збольшага, з’імправізаваць, В’етнам, жнівеньскі, хатынскі, васьмюдзесяццю, кампаньён, атэлье, кагосьці, каньён, Касьян, мядзведзь.

9.Ледзьве, аб’ектыў, шчаўе, льдзінка, пральня, галлё, сядзьце, пісьменны, просьба, аб’імшэць, надвор’е, Об’ю, Сібір’ю, задзьмухаць, пяцьдзесят, малацьба, бязрыб’е, дэкальтэ, Цяньшаньскі, Разанскі.

10.Імпульс, вазьмі, вазня, калісьці, дзверы, мяльчэйшы, зменшыць, мадзьяр, вар’яцтва, калька, з’ява, літаб’яднанне, касьба, льготы, куп’істы, Мальер, снежаньскі, дзве, мадэльер, разанскі, ласьён.

11.Ад’юнкт, саўе, двух’ярусны, італьянец, калье, мільярд, Ілья, кастаньеты, абедзве, дзьме, каханне, аб’інець, аб’ява, меншанькі, без’ядзерны, кудысьці, ісці, ільгота, кончык, струменьчык, чэрвеньскі.

12.Між’ярусны, дальнабойны, васьмісоты, гільяціна, п’едэстал, раз’юшаны, абедзве, едзьце, ліпеньскі, Чэрвеньскі, узмор’е, грозьба, выпраменьванне, барацьбіт, мядзведзь, альпінізм, вараб’іны.

13.Фур’ерызм, барельеф, пад’язны, фельд’егер, вар’іраваць, аб’інець, вынян’чыць, конскі, восеньскі, праменьчык, кончык, соценка, раз’юшаны, звяр’ё, бельетаж, вельвет, вальяжны, без’языкі, абаўю.